Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г.Мінска”

# Пазнавальная праграма
# “Мая кашуля  - маё багацце”

Аўтар:
**Кульбіцкая В.А.**,
культарганізатар
ЦДАДіМ “Ветразь” г.Мінска

**Мінск 2022**

# Пазнавальная праграма “Мая кашуля  - маё багацце”

*Рэквізіт і абсталяванне:* праектар, кампутар, калонкі, лісты з заданнем.
*Мэта:* Арганізацыя вольнага часу дзяцей падчас канікул.
*Катэгорыя ўдзельнікаў:* 1-4 класы
*Задачы:*

- Пашырыць веды ў галіне традыцый і звычаяў;
- Прывіць павагу да беларускай культуры.

**Вядучая:** Прывітанне, шаноўныя сябры! Рада бачыць вас на пазнавальнай праграме “Мая кашуля – маё багацце”. А ці ведаеце вы, што такое “кашуля”? *(адказы)* Так, кашуля – гэта рубашка. А якія віды кашулі бываюць? *(адказы)* Добра, мужчынская, жаночая і дзіцячая.
**Вядучая:**  Вось, паглядзіце, калі ласка, на экран, як выглядае кожны від кашулі.

*Прэзентацыя “Беларуская кашуля”*

**Вядучая:** Кашуля з’яўляецца абавязковай часткай нацыянальнага касцюма беларусаў. З яе пачыналася жыццё чалавека. Кашуля мае і магічны сэнс. Калі нараджалася дзіця – першае, што рабілі, гэта абгортвалі яго ў кашулю бацькі. Ведаеце, для чаго? Каб дзіцёнак любіў і паважаў сваіх бацькоў. Таксама немаўля маглі пакласці ў матуліну спадніцу. Але ж, калі хто з бацькоў меў складаны і рэзкі характар, таго адзення не выкарыстоўвалі. Часам хлопчыка загортвалі ў адзенне маці, а дзяўчынку — у адзенне бацькі, каб такім чынам забяспечыць мір і спакой у сям'і. Лічылася, калі ўкруціць нованароджанае дзіця ў кашулю дзеда, яно будзе доўга жыць.

**Вядучая:** Магічная сувязь існуе паміж чалавекам і яго адзеннем. Так сарочка, пашытая дзяўчынай для каханага, становіцца ў далейшым для яго абярэгам, а першыя кашулькі для немаўлятак шылі са старой сарочкі маці. Лічылася, што ў гэтым выпадку тканіна, што кантактавала з целам парадзіхі, здольная была захаваць дзіця ад хвароб і сурокаў.  А зараз прапаную пазнаёміцца з прымаўкамі наконт кашулі і выказаць сваю думку, як вы разумееце сэнс дадзенага тэксту.

*Прэзентацыя “Народныя прымаўкі”*

1. Нарадзіўся ў кашулі.
2. Веру змяніць – не кашулю пераапрануць.
3. Пляма з кашулі змываецца мыццём, а пляма з душы здымаецца словам.
4. Бурлак, як сірата: калі белая кашуля – тады і свята.

5. Выцвілую кашулю не зробіш ужо новай.
6. Бядняк і кашуле рады, а багаты і кажуха цураецца.

**Вядучая:** Вось бачыце, які цікавы і глыбокі сэнс нясе кожная прымаўка. Але ж сёння мы будзем з вамі размаўляць не толькі пра кашулю, а пра адзенне ўвогуле. Роля адзення ў радзінных, вясельных і пахавальных абрадах вызначалася змяненнем статуса чалавека. Гэта самыя асноўныя этапы ў жыцці чалавека. Абярэгавы статус атрымлівалі тыя віды адзення, што непасрэдна прыкрывалі зоны кантакту: кашуля, фартух, нагавіцы. Але ж, спачатку трэба было пашыць адзенне, а затым і даглядаць за ім. Тут існаваў цэлы комплекс народных прыкмет. І наступнае **заданне сабраць з дадзеных слоў прыкметы,** якія вы ўбачыце на экране.

*Прэзентацыя "Народныя прыкметы"*

**1.** Той, хто падшывае адзенне, не зняўшы яго з сябе, зашые сваю памяць. Каб такое не здарылася, трэба ўзяць што-небудзь у зубы;

**2**. У працэсе шыцця любага адзення, нельга нічога есці, каб вопратка доўга насілася.

**3.** Калі ніткі блытаюцца, то ў гэты момант дзесьці пляткараць аб швачцы ( г.зн. сплетнічаюць аб швее).

**4**. Калі мыеш або шыеш бялізну, нельга есці хлеб, мак, каноплі, бо ў бялізне будуць вельмі весціся вошы.

**5**. Каб спраўленая абнова добра і доўга насілася, апранаць яе першы раз трэба было не ў госці, не на свята, а ў царкву і па магчымасці ў такі дзень, калі там мала народу.

**6.** Нешчаслівым для апранання чыстай сарочкі лічыўся панядзелак. Калі чыстае адзенне і асабліва бялізна (хусце) не было накладзена ў нядзелю, то трэба пачакаць аўторка.

**Вядучая:** Малайцы! Добра справіліся з заданнем. І працягваем нашу праграму. Асабліва нашы продкі ставіліся да такіх прадметаў адзення як сарочка, штаны, фартух, галаўныя ўборы, абутак. Так, калі чалавек баяўся сурокаў, яму раілі спачатку надзець сарочку навыварат. Шапку, каб не балела галава, нельга круціць на кулаку і калі такое здарыцца, трэба пахадзіць тры дні без шапкі ці насіць другую. Той, хто хацеў, каб удзень шчасціла, павінен быў абуваць раніцай спачатку правую нагу, а потым левую.

**Вядучая:** Хочацца ўзгадаць такі момант, калі маленькія дзеці ў выглядзе гульні пераапраналіся ў мужчынскае ці жаночае адзенне. Дык вось, хлопцам нельга адзявацца ў дзявочае ўбранне, як і дзяўчыне нельга класці на сябе мужчынскія порткі ці шапку. Як вы думаеце, чаму быў такі забарон? (*адказы*). Ня можна так рабіць, таму што нячыстая сіла можа замяніць тых

людзей – хлопца зробіць дзяўчынаю, ці дзяўчыну хлопцам, ды загадае сабе служыць. А анёл тады адступіцца ад таго чалавека. Хлопцу нельга надзяваць на галаву жаночыя шапкі або хусткі, бо ён будзе ўсяго палохацца, бы дзяўчына. Калі дзяўчына надзене мужчынскую шапку, то будзе вельмі хутка ўлюбляцца ў хлопцаў.

**Вядучая:** І наступнае заданне заключаецца ў тым, што вашай увазе будуць прадстаўлены ілюстрацыі беларускай вопраткі і вы павінны будзеце адгадаць, што гэта за адзенне і даць адказ на беларускай мове. Зразумела? Што ж, пачынаем!

*Прэзентацыя "Беларускае адзенне"*

1. Нагавіцы (штаны)
2. Кашуля (рубашка)
3. Хустка (касынка)
4. Андарак (андарак)
5. Спадніца (юбка)
6. Фартух (фартук)
7. Гарсэт (гарсет)
8. Скіндачка (намітка)
9. Лапці (лапці)
10. Аблавуха (шапка-вушанка)
11. Жупан (кафтан)
12. Магерка (валяная шапка з палямі)

**Вядучая:** Выдатна! Я рада, што вы так добра валодаеце ведамі аб беларускім адзенні. Яшчэ трэба адзначыць, што беларусы надавалі асаблівую ўвагу пры тлумачэнні сноў, у якіх выкарыстоўвалася пэўнае адзенне. Калі чалавек бачыў сябе ў сне ў чорным адзенні, яму прадказвалі хваробу, жалобу і смутак. Белае адзенне было сімвалам будучых добрых падзей у жыцці. А вось, што тычыцца новага і старога адзення, тут усё было наадварот: новае сімвалізавала хуткую хваробу, а старое абяццала здароўе і весялосць. Калі дзяўчына ўбачыць у сне вянок, яе чакае хуткае замужжа. Калі каму-небудзь прыснілася, што ён апранае андарак, трэба было чакаць гасцей, а калі спадніцу - спатканне з каханым. На хуткае атрыманне грошай паказвала вязанне панчохаў, а шапка на галаве абяцала блізкае падарожжа і запрашэнне ў госці.

**Вядучая:** Як бачыце, адзенню надавалася вялікая ўвага. А зараз прапаную паглядзець, якія ж прыгожыя нацыянальныя касцюмы існуюць на Беларусі.

*Прэзентацыя "Беларускі нацыянальны касцюм"(відэа 1)*

**Вядучая:** Ці спадабалася вам? Выдатна! Наша праграма падыходзіць к канцу і хацелася б напрыканцы правесці невялічкую віктарыну, каб замацаваць тыя веды, пра якія вы сёння даведаліся.

*Віктарына:*

1. Што такое кашуля?
2. Які рытуал выконвалі, калі нараджалася дзіця?
3. Якія віды кашулі існуюць?
4. Чаму нельга зашываць на сабе адзенне?
5. Чаму нельга есць хлеб, мак і каноплі пры мыцці бялізны?
6. Які дзень лічыцца нешчаслівым для апранання чыстай сарочкі?
7.Чаму нельга пераапранацца ў мужчынскае ці жаночае адзенне супрацьлегламу полу?
8. Які галаўны ўбор насілі замужнія жанчыны?

**Вядучая:** Выдатна! Вы – вялікія малайцы! Цяпер вы ведаеце, якое значэнне надавалася кашулі і якое важнае месца яна займае ў жыцці чалавека. А цяпер прыйшоў час развітвацца. Дзякуй за ўвагу! Да новых сустрэч!

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**


1. Лобачевская О.А., Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А. Лобачевская, З. И. Зимина. – 2-е изд. – Минск: Беларус. Навука, 2013. – 279 с.:ил.
2. Раманюк М. Ф. , Беларускае народнае адзенне/ М. Ф. Раманюк, - Мінск: 1981. – 234 с.: іл.